Community-led Urban Strategies in Historic Towns (COMUS)

Funded by the European Union and the Council of Europe

EUROPEAN UNION

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

Implemented by the Council of Europe

# ДЭКЛАРАЦЫЯ КІРАЎНІКОЎ ПІЛОТНЫХ ГАРАДОЎ ПРАЕКТА COMUS

Мы, кіраўнікі пілотных гарадоў праекта "Урбаністычныя стратэгіі гістарычных гарадоў, скіраваныя на супольнасці " (COMUS), на сустрэчы ў Тбілісі і Душэці (Грузія) 7-8 снежня 2016 года,

- разглядаючы спадчыну як рэсурс і важкі інструмент дэмакратызацыі працэсу гарадскога развіцця;
- прызнаючы важную ролю ўдзелу грамадства, сінэргетычных і інклюзіўных працэсаў у галіне планавання, праектавання, выкарыстання і кіравання спадчынай;
- улічваючы неабходнасць інтэграцыі спадчыны ў стратэгічныя планы і мясцовую горадабудаўнічую палітыку,

пацвярджаем нашу зацікаўленасць у рэкамендацыях і наступных кроках, прапанаваных праектам COMUS, і вітаем наступную Дэкларацыю:

- Мы падтрымліваем методыку праекта COMUS ў плане стымулявання сацыяльна-эканамічнага развіцця шляхам выкарыстання культурнай спадчыны ў гістарычных гарадах;
- Мы абавязуемся забяспечыць палітычную і фінансавую падтрымку выпрацоўцы прыярытэтных крокаў у адпаведнасці з Кіруючымі планамі, далейшым засваенні методыкі праекта і ўнясенні неабходных мер у нашу мясцовую палітыку, а таксама ўключэнню ў нашы стратэгічныя планы інтэграванага падыходу да культурнай спадчыны і гарадскога планавання;
- Мы запрашаем іншыя гарады разгледзець гэты падыход і спрыяць павялічэнню супрацоўніцтва паміж гарадамі з мэтай вырашэння агульных праблем, аб'ядноўваючы рэсурсы;
- Гэтым мы абвяшчаем сваю гатоўнасць супрацоўнічаць з пілотнымі гарадамі праекта COMUS і сусветнымі партнёрамі, каб забяспечыць эфектыўную рэалізацыю і супрацоўніцтва паміж усімі мясцовымі зацікаўленымі бакамі і дзяржаўнымі структурамі.

Падпісана ў Душэці ___________________________